№2
КРАСАВІК 2007

# Выбар

Газэта Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў

# У Маскве міліцыя ўжыла сілу супраць удзельнікаў апазыцыйных акцыяў



НА ТУРГЕНЕЎСКАЙ ПЛОШЧЫ Ў МАСКВЕ КАЛЯ ТЫСЯЧЫ ЧАЛАВЕК ПРАВЯЛІ МІТЫНГ АПАЗЫЦЫЙНАГА РУХУ "ІНШАЯ РАСЕЯ". У РАСЕЙСКАЙ СТАЛІЦЫ СЁНЬНЯ МЕЎСЯ ПРАЙСЬЦІ "МАРШ НЯЗГОДНЫХ". НА ПАДЫХОДАХ ДА ПУШКІНСКАЙ ПЛОШЧЫ, АДКУЛЬ ПЛЯНАВАЛАСЯ ПАЧАЦЬ МАРШ, БЫЛІ ЗАТРЫМАНЫЯ - ПАВОДЛЕ АФІЦЫЙНЫХ ЗЬВЕСТАК - 170 ЧАЛАВЕК. СЯРОД ІХ - ЛІДЭР АБ'ЯДНАНАГА ГРАМАДЗЯНСКАГА ФРОНТУ ГАРЫ КАСПАРАЎ І НЕКАЛЬКІ ЖУРНАЛІСТАЎ.

На самой Пушкінскай плошчы былі затрыманыя лідэры маладзёвага "Яблака" і маладзёвага руху "Да" – Ільля Яшын і Марыя Гайдар. Улады не дазволілі праводзіць марш – толькі мітынг на Тургенеўскай плошчы. Людзей, якія спрабавалі прайсьці на Пушкінскую плошчу, жорстка зьбівалі.

Сёньня ў Маскве праходзілі яшчэ некалькі мітынгаў – левых на Тэатральнай плошчы, Саюзу правых сілаў – на Славянскай, нацыяналістаў – на Балотнай плошчы. На Вараб'ёвых гарах і ў Навапушкінскім сквэры мітынгаваў рух "Маладая гвардыя".

*Радыё Свабода*

















ГРАМАДЗКАСЬЦЬ

## "Асацыяцыя вольных беларускіх гісторыкаў" плянуе правесьці ўстаноўчы сход

Грамадзкае аб'яднаньне "Асацыяцыя вольных беларускіх гісторыкаў" плянуе правесьці ўстаноўчы сход напрыканцы кастрычніка. Аб гэтым паведаміла старшыня арганізацыйнага камітэту грамадзкага аб'яднаньня Ніна Стужынская.

"На апошнім сходзе прысутнічала шмат людзей. І гэта мяне вельмі радуе, – распавядае Н. Стужынская. – Падчас апошняга паседжаньня мы канчататкова вызначыліся з назвай: "Асацыяцыя вольных беларускіх гісторыкаў". Канешне, разглядаліся магчымасьці надаць нашай асацыяцыі юрыдычны статус. Мы атрымалі прпанову ўвайсьці ў склад міжнароднага грамадзкага аб'яднаньня "Акадэмія гістарычнай памяці", якое месьціцца ў Вільні. Зараз спадар Кіштымаў займаецца вырашэньнем гэтага пытаньня".

На наступным тыдні "Асацыяцыя вольных беларускіх гісторыкаў" плянуе правесьці арганізацыйны сход, на якім і будзе прызначана дата ўстаноўчага сходу. Паводле словаў Ніны Стужынскай, праекты неабходных дакумэнтаў ужо ёсьць.

Спн. Стужынская не выключае, што асацыяцыя паспрабуе атрымаць юрыдычную рэгістрацыю ў Беларусі ці далучыцца да грамадзкага аб'яднаньня, якое ўжо мае афіцыйны статус.

Аб'ядначца ў "Асацыяцыю вольных беларускіх гісторыкаў" вырашылі звольненыя з палітычных матываў з Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі дасьледнікі і гісторыкі –

Ніна Стужынская, Тацяна Процька, Генадзь Сагановіч, Андрэй Кіштымаў, Сяргей Тарасаў і іншыя.

*Марыя Кароль*

# "Пабоішча ў Маскве – спроба ўлады сілай падавіць страх у самой сабе"

Яднаньне Беларусі і Расеі пераходзіць у практычную плашчыню. Жорстка зьбітыя ўдзельнікі мірнай дэманстрацыі, у тым ліку жанчыны і старыя, арышты арганізатараў маніфэстацыі, шчыльныя кардоны міліцыі, якія не даюць гараджанам прайсьці па сваім горадзе – гэта пра Менск ці пра Маскву? Зараз ужо – пра абедзьве сталіцы.

Падабенства і ў неадэкватнасьці дзяржаўнага гвалту патэнцыйнай пагрозе. У маскву АМОНаўцаў сьцягнулі з усёй Расеі , каб супрацьстаяць, як высьветлілася, адносна нешматлікай і, нягледзячы на рэвалюцыйную рыторыку лідэраў, мірнай дэманстрацыі: Пушкінская плошча – ня Красная, Крэмль далёка.

Ужо жорсткі разгон некалькі тыдняў таму дэманстрацыі апазыцыі ў Ніжнім Ноўгарадзе паказаў, што расейскія кіраўнікі робяцца старанымі вучнямі сваіх беларускіх калегаў, і ўсё часьцей дзейнічаюць паводле прынцыпу героя Салтыкова-Шчадрына: «Тащить и не пущать».

Навошта, дакладней – чаму? Навошта на тле завоблачных рэйтынгаў папулярнасьці паводзіць сябе так, нібыта рэвалюцыя на парозе?

"Падтрымкі большасьці ўжо мала. Трэба, каб падтрымлівалі ўсе. Ці баяліся ўсе, хто не падтрымлівае. Ці баяліся ўсе".

Справа хіба ў прыродзе ўлады – што беларускай, што расейскай. Падтрымкі большасьці ўжо мала. Трэба, каб падтрымлівалі ўсе. Ці баяліся ўсе, хто не падтрымлівае. Ці баяліся ўсе.

У Расеі, магчыма, гэтае новае стаўленьне да пратэстаў абумоўлена наблізкэньнем выбараў, і ня сёлетніх думскіх, а галоўных , прэзыдэнцкіх, да якіх застаўся год. У адсутнасьці легітымнай працэдуры пераемнасьці ўлады (бо легітымнасьць дае ці манархічны прынцып, ці свабодныя выбары, а не спэцапэрацыя "Пераемнік") расейскай уладзе мроіцца прывід Смуты. Тут і ў слабенькіх пратэстах чуецца голас хлопчыка з казкі Андэрсэна: "А кароль жа голы!" Ці больш па-руску: «Царь-то ненастоящий!»

Адсюль і пабоішча ў цэнтры Масквы – спроба дэманстрацыяй сілы падавіць страх у саміх сабе.

*Юры Дракахруст*

№2 КРАСАВІК 2007
Выбар
Газэта Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў

МНЕНИЕ ЭКОНОМИСТА



Андрей ЮРКОВ
тел. 623 61 08

# Кому достанутся лакомые кусочки?

Одним из наиболее значительных событий последних дней в нашей стране была пресс-конференция Александра Лукашенко, на которой присутствовали в том числе и представители независимых СМИ. Поскольку основная часть ответов касается непосредственно экономики, попробуем проанализировать и спрогнозировать дальнейший ход событий.

Очень пафосно из уст Александра Григорьевича прозвучало: «Мы выдержали удар с Востока». Здесь можно согласиться, поскольку сегодня платим за газ не 100, а реально всего лишь 55 долларов, и пошлина на нефть не 170, а 50 долларов. Но о каком ударе тогда идет речь? На мой взгляд, Россия нас попрежнему содержит, хотя и в меньших размерах.

Очень интересно было слышать, что пора отучать сельхозпроизводителей от советской «соски» и главным показателем для колхозов станут прибыль и рентабельность, но сделано это будет не сразу, а на протяжении где-то двух лет. Вот в этих словах А.Лукашенко и прячется, как говорил классик, «Сермяжная правда». Российское правительство еще зимой ясно дало понять, что на протяжении двух лет цены для Беларуси на энергоносители будут подняты на мировой уровень. Поэтому реально нужно говорить не про удар с Востока, а констатировать, что нас просто отучают от советской «соски», и не колхозы, а всю Беларусь целиком. Вот А.Г. и начинает готовить почву под будущие непростые времена. Параллельно он показывает «так называемой оппозиции» и козыри, озвучивая цены за приватизацию «Беларуськалия», «БеСТа», «Велкома», и.т.д.

Суммы и вправду немалые и способные доказать оппонентам, что даже в форс-мажорных условиях средств на прокорм электората хватит надолго. В принципе, для экономики озвученный вариант приватизации – уже хоть что-то, поскольку частник всегда работает эффективнее, чем наймит. Но само собой сразу же появляется вопрос: «А куда пойдут деньги от приватизации?» Почему сегодня, или раньше, в середине 90-х, «Беларуськалий», БМЗ, «Нафтан», и.т.д. не отдали нам, простым людям, в период чековой приватизации, а отдали только советское «ломьё». Сегодня же самые лакомые кусочки белорусской экономики и госимущества некий «добрый дядька» спокойно распродаст, проест (нам, исходя из имеющегося опыта, достанутся, как всегда, в лучшем случае чарка и шкварка) за определенное время, а как мы будем жить дальше? Олигархов в стране появится немало, но кто их тогда будет контролировать – нищий, вконец одуренный и бесправный народ?

Видимо, именно поэтому А.Г.Лукашенко критиковал западные компании, которые, предлагая свои проекты строительства в Беларуси новой современной АЭС, поставили условия: проведение свободных выборов и реальная независимость СМИ. И в самом деле – только начали выходить на понимание неизбежности приватизации и постепенно приступать к ней, а тут – на тебе! А как же потом «прихватизировать», если повсюду будут лезть со своими неприятными вопросами разные независимые депутаты и журналисты?

Любому понятно, что отдать имущество народу – это отдать ему же и власть. Но ведь пока народ и сам за то же имущество (и власть!) не слишком сражается. Зачем же тогда спешить? Примерно так рассуждают наши «верхи». И только мы вместе, уважаемые обыватели, можем сдвинуть этот лежачий камень с места, начать полнокровную жизнь и эффективным трудом дать толчок строительству собственного будущего.

ГРАМАДЗТВА

## У Магілёве прайшла дыскусія на тэму пэрспэктываў у эканамічным і палітычным жыцьці краіны

Афіцыйна мерапрыемства, якое адбылося ў Магілёве ў мінулыя выходныя, сьціпла называлася сэмінарам для актыву дэмакратычных НДА. Аднак якасьць тых дакладаў, якія прагучалі на сэмінары, а таксама зьмест дыскусіі, якая іх суправаджала, паводле меркаваньня ўдзельнікаў, цалкам адпавядалі кшталту грамадзкіх слуханьняў.

Перад больш як 30 грамадзкімі актывістамі выступілі прафэсар, сябра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, акадэмік Міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналёгіяў Іван Нікітчанка, а таксама – вядомы палітык, шэф-рэдактар газэты "Новы Час" Аляксей Кароль. На рукі прысутным былі раздадзеныя таксама выступы Станіслава Багданкевіча, Мечыслава Грыба і Леаніда Злотнікава, якія, на жаль, ня здолелі асабіста ўзяць удзел у мерапрыемстве.

Найбольш вострую дыскусію сярод удзельнікаў выклікала тэма постчарнобыльскай палітыкі ўраду краіны. Іван Нікітчанка прывёў шматлікія факты неразуменьня ўладамі сэнсу чарнобыльскіх праблемаў і няправільнай сацыяльнай палітыкі на забруджаных тэрыторыях. Як вынікала з дакладу Аляксея Караля, да "чарнобыльскага бяспраўя" нашых грамадзянаў з кожным днём дадаецца ўсё больш бяспраўя і ва ўсіх іншых сфэрах жыцьця.

Прадстаўнікі магілёўскага "трэцяга сэктару" ў часе дыскусіі прывялі шматлікія прыклады, якія дапаўнялі дакладчыкаў мясцовымі фактамі. "Толькі валоданьне фактамі й давядзеньне іх да людзей можа запабегчы пагаршэньню сытуацыі ў Беларусі", - адзначыў пасьля правядзеньня сустрэчы адзін зь яе ўдзельнікаў.

*Віктар Войт*

ЭКАЛЕГІЯ

### ВАЛЯНТЭРЫ ЎПАРАДКАВАЛІ "ПАЛЫКАВІЦКУЮ КРЫНІЦУ"

У справу паляпшэньня экалягічнай сытуацыі ў родным горадзе і захаваньня прыроды зрабілі свой унёсак магілёўцы. 11 і 12 красавіка адбылася валянтэрская акцыя па пасадцы дрэў і ўборцы тэрыторыі каля помніка прыроды рэспубліканскага значэньня "Палыкавіцкая крыніца", што месьціцца каля вёскі Мікалаеўка-2 на мяжы Магілёўскага раёну і ўскраіны гораду.

Арганізатарамі акцыі выступілі дэпутат магілёўскага гарадзкога Савету дэпутатаў Аляксандар Агееў і старшыня магілёўскай гарадзкой арганізацыі ТБМ Алег Д'ячкоў.

Да акцыі былі надрукаваныя беларускамоўныя абвесткі са зваротам да жыхароў бліжэйшага мікрараёну "Саломінка" з заклікам прыняць удзел у пачэснай справе. Актыўна ўдзельнічалі ў акцыі грамадзкія актывісты, студэнты, школьнікі і простыя магілёўцы.

Нягледзячы на будзённы дзень і халаднаватае надвор'е, штодня саджалі дрэвы больш 30 чалавек.

*Тацяна Барысік*

САЦЫЯЛКА

# Эканомія на льготах

**БЕЛАРУСКІЯ ЎЛАДЫ ПЛЯНУЮЦЬ ЗАКАНАДАЎЧА АФОРМІЦЬ АДМЕНУ ЛЬГОТАЎ ДЗЕЛЯ ШЭРАГУ КАТЭГОРЫЯЎ ГРАМАДЗЯНАЎ. У ВЫНІКУ ДЗЯРЖАВА СПАДЗЯЕЦЦА ЗЭКАНОМІЦЬ КАЛЯ 1 ТРЛН. РУБЛЁЎ.**

Гэты дакумэнт больш за тры гады знаходзіцца ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, але дэпутаты мінулага скліканьня так і не адважыліся пазбавіць дзяржаўных сацыяльных гарантыяў малазабясьпечаныя катэгорыі грамадзянаў. Напрыклад, згодна з законапраектам, плянуецца пазбавіць ільготаў на атрыманьне бясплатных лекаў дзяцей ва ўзросьце да трох гадоў, а навучэнцы і студэнты мусяць цалкам аплачваць паездкі ў гарадзкім грамадзкім транспарце. Апошнім таксама, магчыма, будзе скасаваная 50-адсоткавая льгота на праезд па краіне падчас вучэбнага году. Акрамя таго, пад скарачэньне патрапяць чарнобыльскія выплаты, ільготы вязням канцлягероў, блякаднікаў і г.д. Некранутымі застануцца толькі сацыяльныя гарантыі вэтэранаў Вялікай Айчыннай вайны, інвалідаў першай і другой групаў.

Падчас прэс-канфэрэнцыі 12 красавіка Аляксандар Лукашэнка заявіў, што робіцца гэта ўсё згодна зь яговым загадам.

Лукашэнка: "Тое, што зараз абмяркоўваецца ў парлямэнце, гэта былі павінны прыняць яшчэ дэпутаты мінулага скліканьня. І там абмяркоўваць няма чаго. Гэта тыя льготы, якія зараз ужо маім рашэньнем былі скасаваныя. І гэта проста трэба перанесьці ў закон".

Паводле прэзыдэнта, справа ў тым, што шмат якія цяперашнія льготы прымаліся яшчэ за сталінскім часам. Але, як адзначыў Лукашэнка, грошы, якія атрымае бюджэт ад скарачэньня льготаў, будуць размеркаваныя па іншых сацыяльных накірунках.

Лукашэнка: "Гэтыя льготы будуць пераарыентаваныя на шматдзетных, на дзяцей, на дзіцячае харчаваньне і іншае. Вось на гэтыя праграмы, гэта значыць, на дзяцей, на маці, на сям'ю, на ахову здароўя".

Але што рабіць іншым катэгорыям грамадзянаў, Лукашэнка не паведаміў. Пэўна, гэта павінна застацца іх асабістай праблемай.

Былы міністар працы Аляксандар Сасноў сказаў Рацыі, што ўвогуле падтрымлівае прапанову кіраўніка дзяржавы, але падыходы ўраду для яго зьяўляюцца непрымальнымі.

Сасноў: "У такой беднай краіне, як наша, абыйсьціся безь ільготаў немагчыма, але, у прынцыпе, гэта лібэральная ідэя, і я, як лібэрал, яе падзяляю. Трэба не льготы, а трэба, каб людзі мелі магчымасьць зарабляць. А тыя, хто ня можа зарабляць, павінны атрымоўваць дапамогу ад дзяржавы. У нас жа, на жаль, гэтыя і без таго невялікія льготы размеркаваныя паміж усімі катэгорыямі грамадзянаў. У тым ліку імі карыстаюцца і тыя, хто ў гэтай дапамозе ня мае патрэбы".

Напрыклад, па яговых словах, больш танная аплата кватэры. Такая льгота распаўсюджваецца і на багатых, і на бядноту. У гэтую катэгорыю чамусьці трапілі й чыноўнікі, якія зараз маюць велізарныя заробкі. У выніку страты нясуць камунальнікі, якія, у сваю чаргу, атрымоўваюць датацыі зь дзяржаўнай кішэні. Таму адзінае выйсьце, калі сур'ёзна падыходзіць да гэтай праблемы, сапраўды ўзьняць пэнсіі і іншыя сацыяльныя выплаты да таго ўзроўню, каб кожны грамадзянін сам меў магчымасьць разьлічваць на сябе без усялякіх ільготаў.

А якія сацыяльныя гарантыі маюць былыя кіраўнікі Беларусі? Першым, да каго з гэтым пытаньнем зьвярнулася Рацыя, быў старшыня Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня Станіслаў Шушкевіч.

Шушкевіч: "У мяне няма ніякіх ільготаў, у мяне ёсьць пэнсія — тры тысячы дзьвесьце рублёў. Яна ніколі не індэксавалася. Між іншым, згодна з законам, я павінен атрымоўваць зусім іншую пэнсію. Але ў 1997 годзе Лукашэнка выдаў дэкрэт, і з той пары, як абясцэніўся рубель, так і мая пэнсія абясцэнілася ў дзьвесьце разоў".

У тое, што новым законам сапраўды будзе забясьпечаная нейкая сацыяльная справядлівасьць, Станіслаў Шушкевіч ня верыць.

Шушкевіч: "Я ведаю, што ёсьць шэраг ільготаў абсалютна неабгрунтаваных, якія маюць былыя кіраўнікі кампартыі Беларусі і іншыя... Але думаю, што іх гэты законапраект не закране. А што тычыцца бядноты, то, як і заўсёды, калі трэба недзе знайсьці грошы, іх адбіралі ў самых бедных".

Былы кіраўнік Савету Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, акадэмік Аляксандар Вайтовіч таксама кажа, што ніякіх ільготаў ад дзяржавы зараз ня мае.

Вайтовіч: "Болей таго, пэнсіі атрымліваю толькі палову. Таму што цалкам пэнсію могуць атрымліваць толькі працуючыя ваенныя пэнсіянэры. А калі звычайны чалавек працуе на пэнсіі, то ён атрымлівае толькі палову грошай".

Вось такая, паводле некалі трэцяй асобы ў дзяржаве, у Беларусі сацыяльная "справядлівасьць".

Амаль нічога не засталося ад ільготаў і ў былога міністра абароны Паўла Казлоўскага. Сацыяльная абарона былых вайскоўцаў пакрыху скарачалася, і зараз ад прэстыжу прафесіі амаль нічога не засталося.

Казлоўскі: "Як вязень фашызму я маю льготы, але як былому міністру для мяне ніякіх ільготаў няма. Усё, што было можна, яны паскарачалі. Раней асноўныя былі льготы ў галіне санаторна-курортнага лячэньня й мэдычнага забесьпячэньня. Зараз усё гэта адменена, у тым ліку й бясплатныя лекі".

Такім чынам, Лукашэнка ня схлусіў, калі сказаў, што большасьць ільготаў ужо даўно скасаваная. Але казаць пра тое, што гэтыя сродкі пайшлі мэтанакіравана на падтрымку мацярынства й дзяцінства, таксама не выпадае, бо выплаты па цяжарнасьці й догляду за дзіцем як былі мізэрнымі раней, так і засталіся. Куды ж тады падзеліся гэтыя грошы?

*Кастусь Вансяцкі*

ЗАКОН, ЦІ ДЫШЛА?

# Міліцыянты спрабавалі ўварвацца ў адзін з прыватных дамоў у Магілёве

Спроба няпрошаных гасьцей зайсьці ў дом доўжылася позьнім вечарам 23 красавіка больш як дзьве гадзіны. Праз жалезныя дьверы, што адгароджвалі людзей у хаце ад нечаканых візыцёраў, міліцэскі афіцэр з маёрскімі пагонамі апраўдваў сваё жаданьне зайсьці ў дом ананімным званком ад суседзяў аб тым, што "ў доме ідзе бойка і ўжываюцца наркотыкі".

За некалькі хвілінаў да візыту ў доме скончыўся сход сябраў грамадзкага руху БНФ "Адраджэньне" і Партыі БНФ. Сход, дарэчы, папярэдне ўзгоднены з абласным упраўленьнем юстыцыі, арганізацыйна зацьвердзіў аднаўленьне таксама і абласной арганізацыі Партыі БНФ. На сустрэчы прысутнічаў і старшыня БНФ Вінцук Вячорка.

Міліцыянты выклікалі на месца падзеі міліцэйскі аўтобус з дадатковымі супрацоўнікамі. Магчыма, што ад запланаванага імі гвалтоўнага ўварваньня ў прыватны дом ім давялося адмовіцца ў сувязі з тым, што да месца здарэньня зьявіліся грамадзкія актывісты і журналісты недзяржаўных выданьняў горада.

Перамовы з афіцэрам міліцыі, які, дарэчы, так і не назваўся, узяў на сябе дырэктар Магілёўскага Праваабарончага цэнтру Ўладзімер Краўчанка. Ён давёў міліцынтам, што яны парушаюць беларускае заканадаўства, паколькі яно гарантуе грамадзянам недатыкальнасьць іхняга прыватнага жыцьця і жытла. Такое парушэньне лічыцца падкрэсьліў праваабаронца, крымінальным злачынствам.

У выніку празь некаторы час аблога была нарэшце зьнятая і прысутныя ў доме змаглі разьехацца.

З панядзелкавай раніцы міжвольныя ўдзельнікі здарэньня разам з праваабаронцамі вырашаюць, ці варта надаць гэтаму здарэньню працяг у выглядзе звароту са скаргай на дзеяньні міліцыянтаў у адпаведныя наглядальныя і ведамасныя органы.

*Віктар Войт*

ГІСТОРЫЯ

# Бабруйскія рыцары змагаліся на Чырвонай Паляне

Бабруйскі клюб ваенна-гістарычнай рэканструкцыі "Газдава" прыняў удзел у спаборах міжнароднага фэстывалю рыцарскіх клюбаў Беларусі ды Расеі, які нядаўна прайшоў непадалёк ад горада Сочы.

Хаця мерапрыемства праходзіла на расейскай тэрыторыіі, арганізатарам яго выступіла канфэдэрацыя рыцараў Вялікага княства Літоўскага. Бабруйская "Газдава", якую ачольвае школьны настаўнік гісторыі Гардзей Шчэрбіч, увайшла ў аргкамітэт спабору.

Як патлумачыў Шчэрбіч, турніры праводзіліся па сярэднявечных правілах. Гэта значыць, што барацьба ў кожнай намінацыі ішла не за месца, а да поўнай перамогі. У праграме фэстывалю значыліся турніры лучнікаў ды пешых ваяроў, рыцарскі конны турнір, а таксама бугурты (групавыя баі). Галоўны прыз – рыцарскі меч – дастаўся ў пешых баях расейскаму рыцару з Тулы. Рыцары з бабруйскай "Газдавы" на гэты раз засталіся без прызоў. Відаць, усе сілы пайшлі на арганізацыю фэстываляў, што адбілася негатыўна на выніках.

*Людміла Родзікава*

ПАДЗЕЛ

# У Магілёве ня будзе сумеснага адзначэньня Чарнобыльскай гадавіны ўладамі і дэмакратамі

Напярэдадні 21-й гадавіны з дня Чарнобыльскай аварыі некалькі грамадзкіх дэмакратычных арганізацыяў скіравалі ліст старшыні Магілёўскага гарвыканкама Віктару Шорыкаву з прапановай сваёй дапамогі ў арганізацыі і правядзеньні гарадзкіх мерапрыемстваў, прысьвечаных гадавіне трагедыі.

У аказе на гэты зварот, які падпісаў першы намесьнік старшыні Алег Ліцянкоў, улада пагадзілася на ўдзел прадстаўнікоў дэмакратычнай грамадзкасьці толькі ў адным мерапрыемстве - у жалобным мітынгу каля Магілёўскага помніка ліквідатарам аварыі на ЧАЭС. Гэты мітынг ладзіць, як паведамляецца ў афіцыйным лісьце, Асацыяцыя работнікаў праваахоўных органаў "Шчыт Чарнобыля". Дэмакраты, падкрэсьліваецца ў адказе, могуць на ім прысутнічаць – як і ўсе іншыя грамадзяне. Зь ліста незразумела, ці прадугледжваюцца ў часе гэтай акцыі прамовы ўдзельнікаў, альбо гэта будзе маўклівая цырымонія ўскладаньня да помніка кветак і вянкоў. Дэмакратаў засмуціла таксама й тое, што яны ўпершыню з гэтага ліста даведаліся пра існаваньне ў горадзе грамадзкай міліцэйскай арганізацыі, аб якой у адказе гаворыцца як пра нібыта актыўна дзейную.

Ні пра якія іншыя гарадзкія мерапрыемствы, як аб гэтым прасілі дэмакраты ў сваім звароце, ліст з гарвыканкаму не паведамляе. Няма ў ім таксама і згоды на сумесны выраб і распаўсюд адпаведнай інфармацыйнай прадукцыі.

Такім чынам, крок дэмакратычных актывістаў насустрач уладзе ў пярэдадзень Чарнобыльскай гадавіны застаўся без падтрымкі.

*Віктар Войт*

ПАМЯЦЬ

## УШАНАВАНЬНЕ ПАМЯЦІ АХВЯРАЎ ЧАРНОБЫЛЮ Ў БАБРУЙСКУ ПРАЙШЛО ПАД ПІЛЬНЫМ НАГЛЯДАМ МІЛІЦЫІ

Каля трох дзясяткаў чалавек прынялі ўдзел у акцыі, якая прайшла ў цэнтры горада, на Пляцы Перамогі. Людзі, трымаючы запаленыя сьвечкі ў руках, прайшлі калёнаю да капліцы на Менскіх могілках.

На месцы збора прысутнічала даволі шмат міліцыянтаў. Намесьнік начальніка гарадзкой міліцыі Сяргей Глушко загадаў патушыць лямпадкі. Удзельнікі адмыслова апрануліся ў адзеньне "колераў радыяцыі": чорны з жоўтым. Некаторыя мелі жоўтыя павязкі на рукавах, у іншых – жоўты шалік на шыі. У руках усе трымалі жоўтыя кветкі.

Удзельнікі акцыі прайшлі галоўнымі вуліцамі горада: Сацыялістычнай ды Савецкай, і, зьвярнуўшы на Менскую, крочылі да капліцы. Там удзельнікі акцыі замовілі малітву за ахвяраў Чарнобыльскай трагедыі, ды ўсклалі кветкі. Пасьля хвіліны маўчаньня ўсе разышліся.

Увесь час калёну суправаджалі тры міліцэйскіх машыны. Праз мэгафоны ўдзельнікаў папярэджвалі пра адказнасьць за несанкцыянаванае публічнае мерапрыемства.

*Аляксей Манакін*

## НА ЎГОДКІ ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ КАТАСТРОФЫ МІТЫНГ ПРАЙШОЎ І Ў МАГІЛЁВЕ

Мітынгу папярэднічала стыхійнае шэсьце 50-ці чалавек, якія трымалі ў руках нацыянальныя сьцягі і жалобныя стужкі з знакам сёлятняга Чарнобыльскага шляху. Шэсьце да месца памятнага Крыжа, усталяванага дэмакратычнай грамадзкасьцю горада больш як 10 гадоў таму непадалёк ад Лаўсанаўскіх могілак, працягвалася каля 15 хвілінаў.

Некалькі міліцэйскіх аўтамашынаў ехалі побач з калёнай людзей, на хаду здымаючы іх з вокнаў машынаў на відэкамэры. Запрошаныя прадстаўнікі ўлады на мітынг не зьявіліся.

*Віктар Войт*

## У БАБРУЙСКУ БЫЛЫЯ ВЯЗЬНІ ФАШЫЗМУ АДЗНАЧЫЛІ ЖАЛОБНУЮ ДАТУ

Урачыста-памінальнай праграмай у гарадзкім тэатры адзначыла Дзень вызваленьня вязьняў фашысцкіх канцлігераў Бабруйская грамадзкая арганізацыя былых ахвяр фашызму "Лёс". Цэнтральным мерапрыемствам дня стаўся канцэрт-рэквіем, прысьвечаны жахлівым падзеям другой сусьветнай вайны. Старшыня ГА "Лёс" Зоя Міцэвіч па шматгадовай традыцыі сымбалічнай пераклічкай згадала імёны памерлых сяброў суполкі. Па заканчэньні канцэрту сябры арганізацыі, а ў асноўным гэта жанчыны, прайшлі да гарадзкой плошчы Перамогі, дзе ля каменя-помніка прачыталі памінальную малітву ды ўсклалі кветкі, а таксама хвілінай маўчаньня ўшанавалі памяць загінуўшых у гады вайны ды памерлых ужо за мірным часам. Грамадзкае аб'яднаньне былых вязьняў фашызму "Лёс" у Бабруйску была створана ў сакавіку 1998 года. Тады ў шэрагах арганізацыі налічвалася чатыры тысячы чалавек. За два апошнія гады з 1975-ці былых вязьняў, што жывуць на сёньняшні дзень у Бабруйску і раёне, памерла 284 чалавекі. Ды і самым малодшым з "Лёса", тым, хто быў народжаны ў канцы вайны на тэрыторыі Германіі, ужо далёка за 60.

*Людміла Родзікава*

ТВОРЧАСЬЦЬ

## МАГІЛЁЎЦЫ ЧЫТАЮЦЬ У ЭТЭРЫ ВЕРШЫ КУПАЛЫ

Вось ужо тры разы ў тэлеэтэры канала "Магілёў-2" гучаць радкі вершаў Янкі Купалы ў выкананьні магілёўцаў, людзей розных узростаў і прафэсіяў. Прапанавалі стварыць такія відэаролікі і дапамагаюць у іх падрыхтоўцы сябры магілёўскай суполкі ТБМ.

Здымкі гэтых сюжэтаў будуць працягвацца і далей. Тэленарысы прымеркаваныя да юбілею народнага песьняра і абуджаюць цікавасьць тэлегледачоў да творчасьці Янкі Купалы, да беларускай літаратуры і роднай мовы.

*Тацяна Барысік*

ІНІЦЫЯТЫВА

## МАГІЛЁЎСКАЯ "ПРАЛЕСКА" АБВЕСЬЦІЛА ПРА СВАЕ ПРШАСНЫЯ НАМЕРЫ І ПЛЯНЫ

Гэтая новая ў рэгіёне грамадзкая ініцыятыва месяц таму аб'яднала каля дзесяці жанчынаў рознага ўзросту і сацыяльнага статусу, якія выявілі жаданьне дапамагаць сабе, грамадзтву і дзяржаве ў вырашэньні сямейных, дзіцячых і жаночых праблемаў.

Лідэрка гэтага праекту Надзея Салаўёва ў часе наладжанай днямі грамадзкай прэзэнтацыі ініцыятывы распавяла некалькім дзясяткам прысутных аб бліжэйшых плянах новага нефармальнага згуртаваньня. Удзельнікі прэзэнтацыі таксама мелі магчымасьць атрымаць тэматычны буклет пра мэты ініцыятывы.

"Пралеска" мае намер атрымаць дзяржаўную рэгістрацыю. На думку кабетаў, гэта дазволіць суполцы хутчэй займець сваё акрэсьленае месца і наладзіць неабходныя дзелавыя сувязі ў асяродзьдзі "трэцяга сэктару" і ў тых дзяржаўных структурах, што займаюцца праблемамі сям'і. Але, як было заяўлена, "Пралеска" пачынае рэальна працаваць нават і без афіцыйнага прызнаньня. Праблемы, якімі апякуецца новая жаночая ініцыятыва, як кажуць удзельніцы ініцыятывы, "ня могуць чакаць ніводнага дня".

*Віктар Войт*

№2 красавік 2007 Выбар
Газэта Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў

КАЛЕГІ

## Юбілей “Жаночай лёгікі”

Намаганьнямі актывістак ГА “Беларуская арганізацыя працоўных жанчын” у Бабруйску выйшаў у сьвет дзясяты нумар бюлетэня “Жаночая лёгіка”, які выдаецца ў Бабруйску з лета 2005 году. Бюлетэнь выходзіць з зайздроснай рэгулярнасцю і заўсёды асьвятляе на сваіх старонках грамадзкае жыцьцё гораду. Здаровы лад жыцьця – падпраграма аднаго з чатырох накірункаў дзейнасьці БАПЖ – “Сям’я”, і чарговы нумар жаночай газэткі прысьвечаны менавіта тэме здароўя. На першай старонцы выданьня — традыцыйнае ўжо экспрэс-апытаньне. На гэты раз бабруйчане мусілі адказваць на пытаньне: “Што вы робіце дзеля свайго здароўя?”. “У дзейнасьці жаночай арганізацыі праца на карысьць здаровага ладу жыцьця заўсёды актуальная, таму і знаходзіць адлюстраваньне старонках нашай “малой прэсы,”-- адзначыла каардынатарка ГА “БАПЖ” у Бабруйску і раёне Людміла Кокаш.

*Людміла Родзікава*

АБЫЯКАВАСЬЦЬ

## Сярод бабруйчанаў салідарных мала

Чарговая акцыя бабруйскіх дэмакратаў на Дзень беларускай салідарнасьці, прысьвечаная памяці зьніклых і падтрымцы палітвязьняў, была рэкордна нешматлікай. На працягу паўгадзіны, з 18-00 да 18-30 ў ланцугу неабыякавых, трымаючы ў руках запаленыя сьвечкі, стаялі ўсяго чатыры чалавекі. Дзея традыцыйна адбываецца побач з капліцай ля Мінскіх могілак. Падчас правядзеньня гэтай акцыі можна было ўбачыць, што грамадзкія актывісты з запаленымі сьвечкамі выклікаюць больш цікаўнасьці ў міліцыі, чым ў бабруйчан.

Паводле сталага ўдзельніка Дзён салідарнасьці Уладзімера, хаця ў Бабруйску акцыі Салідарнасьць-16 праходзяць ужо на працягу года, вялікай колькасьці ўдзельнікаў яны, на жаль, не прыцягваюць. Але ўсё ж такі, як лічаць актывісты, гэта адзін са спосабаў інфармаваць грамадзтва пра тое, што адбываецца ў краіне.

“Сама прыкрае, – кажа Уладзімер, – што гэтым разам ніхто зь мінакоў не падыходзіў і не цікавіўся, што азначае наша стаяньне са сьвечкамі. Хаця народу было шмат, бо сёлета 16 красавіка выпала якраз наконадні Радаўніцы, і людзі на могілкі ішлі”.

Міліцыя актывістам не замінала. Паводле назіраньняў удзельнікаў, цяпер праваахоўнікі пад’яжджаюць пад заканчэньне акцыі. Так адбылося і ў панядзелак. А палове на сёмую прыехалі адразу тры міліцэйскія машыны. Убачыўшы, што акцыя ўжо скончылася, зьехалі, пакінуўшы, на ўсялякі выпадак, патрульных.

*Людміла Родзікава*

ПЕРАШКОДЫ

## Аляксандру Мілінкевічу адмовілі ў тэлеэфіры

**ПЕРШЫ ТЭЛЕКАНАЛ АДМОВІЎ АЛЯКСАНДРУ МІЛІНКЕВІЧУ Ў ПРАМЫМ ЭФІРЫ 25 КРАСАВІКА. ПРА ГЭТА "ІНТЭРФАКСУ" ПАВЕДАМІЛІ НА ТЭЛЕКАНАЛЕ.**

Нагадаем, 6 красавіка А.Мілінкевіч зьвярнуўся да старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлекампаніі з просьбай прадставіць магчымасьць у прамым эфіры абмеркаваць дзейнасьць дзяржаўных органаў па перадоленьні наступстваў чарнобыльскай катастрофы. Таксама спадар Мілінкевіч прасіў даць магчымасьць для ўдзелу ў праграме запрошаных ім прадстаўнікоў экспэртаў і ліквідатараў.

Паводле Аляксандра Мілінкевіча, існуюць сур’ёзныя падставы сьцьвярджаць аб замоўчваньні ўладамі праблемаў, зь якімі сутыкаюцца ліквідатары, людзі, што жывуць на забруджаных тэрыторыях, усе грамадзяне Беларусі, якім у выніку палітыкі ўладаў даводзіцца спажываць прадукты харчаваньня з забруджаных тэрыторый.

Спадар Мілінкевіч заявіў пра тупіковасьць сацыяльна-эканамічнай палітыкі беларускіх уладаў, што не дазваляе эфэктыўна вырашаць паўсталыя праблемы, а таксама атрымліваць у неабходным аб’ёме міжнародную дапамогу ў справе мінімізацыі наступстваў аварыі.

Старшыня тэлекампаніі ў сваім адказе выказаў сумнеў у кампэтэнтнасьці А.Мілінкевіча і незалежных экспэртаў. Ён сказаў, што ў эфір выйдуць перадачы па чарнобыльскай тэматыцы, у якіх апавядаецца пра тое, што Беларусь адна змагаецца з наступствамі гэтай катастрофы.

*Радыё Свабода*

ТВОРЧАСЬЦЬ

## У МАГІЛЁВЕ ПРАЙШЛА ПРЭЗЭНТАЦЫЯ ДАКУМЭНТАЛЬНАЙ СТУЖКІ ВІКТАРА КОРЗУНА "ВЕРЫЦЬ ТОЛЬКІ ВЕТРУ"

Грамадзкі прагляд фільма быў арганізаваны рэгіянальным Цэнтрам маладзёвых ініцыятываў, які спэцыялізуецца на асьветніцкай працы з моладзьдзю. Паглядзець на стужку, прысьвечаную Чарнобылю, сабралося дастаткова шмат старшаклясьнікаў і студэнтаў.

За некалькі хвілін перад пачаткам прагляду стала вядома, што Віктар Корзун асабіста ня зможа прысутнічаць на магілёўскай прэзэнтацыі, як было папярэдне абвешчана. Аднак хутка выявілася, што адсутнасьць аўтара не зашкодзіла самому ўспрыняцьцю фільма.

“Верыць толькі ветру” гаворыць гледачам усё, што трэба, сам – без дадатковых камэнтароў і тлумачэньняў. Шчыры фільм на пост-чарнобыльскую тэматыку зроблены з увагай і любоўю як да пэрсанажаў, так і да гледачоў, пакідаючы ім неабходную прастору для асабістых высноваў і эмоцыяў.

Менавіта такім чынам, як пра гэта казалі самі ўдзельнікі прэзэнтацыйнага прагляду, фільм паўплываў на магілёўскую моладзь.

*Віктар Войт*

ДАБРАЧЫННАСЬЦЬ

## ГІШПАНСКАЯ "БЯРЭЗІНА" У БАБРУЙСКУ

Цэлы тыдзеньу бабруйскіх сем’ях, дзеці зь якіх пабылі на аздараўленьні ў Кардове, гасьцявалі іх гішпанскія сябры. Гішпанскую дэлегацыю ўзначальваў старшыня дабрачыннай асацыяцыі “Бярэзіна”, яе стваральнік Хаакін Маркес Салас. Гішпанцы, у семьях каторых летам адпачывалі маленькія бабруйчане, прыехалі ў Беларусь, зь іх слоў, дзеля таго, каб болей даведацца пра беларускую культуру, традыцыі ды ўмовы жыцьця іх маленькіх сяброў, навучэнцаў сярэдняй школы №8 ды Славянскай гімназіі.Стасункі з гэтымі адукацыйнымі ўстановамі асацыяцыя “Беразіна“ усталявала яшчэ ў 2001 годзе. У абедзьвюх школах у якасьці замежнай вывучаюць гішпанскую мову, чым і быў абумоўлены выбар. Так што падчас наведваньня САШ №8 цяжкасьцяў з перакладам не было.Апрача ўсяго, у якасьці культурнай праграмы, для гасьцей з далёкай Кардовы былі зладжаныя экскурсіі ў Дудуткі і на шклозавод “Нёман.”

*Людміла Родзікава*

ТВОРЧАСЬЦЬ

## Бабруйская «Вясна» прэзэнтавала новы зборнік

Днямі адбылася грамадзкая прэзэнтацыя новага зборніка паэзіі самадзейнага аб’яднаньня “Вясна”. Кніжка, прадстаўленая на ўвагу чытача, мае назву “Роднички душевного порыва”. У ёй зьмешчаны вершы дванаццаці бабруйскіх паэтаў, пяцёра зь якіх – сябры гарадзкога таварыства інвалідаў.

Сустрэча з паэтамі, якую зладзіў клюб пэнсіянэрак “Яшчэ ня вечар”, доўжылася больш за дзьве гадзіны. Прысутныя цёпла сустрэлі вершы ў аўтарскім выкананьні Міхайлавай, Бацютавай, Сьцефаненка, Булко, Касьцяна.

Пакуль кніжка выдадзена накладам усяго ў 25 асобнікаў – па два асобнікі кожнаму з аўтараў. Паводле словаў кіраўніка самадейнага паэтычнага клюба Васіля Касьцяна, спачатку гарвыканкам паабяцаў ім фінансавую падтрымку, але нешта не атрымалася, і друкавацца давялося за свой кошт. Літаратары спадзяюцца, што да 9 траўня праблема будзе вырашаная, і ўдасца аддрукаваць яшчэ па 5 асобнікаў кожнаму з аўтараў.

*Людміла Родзікава*

## Вольнае слова для беларускіх журналістаў

Грамадзкае аб’яднаньне “Беларуская асацыяцыя журналістаў” абвесьціла традыцыйны штогадовы конкурс “Вольнае слова”. Мэта журналісцкага спабору – стымуляваньне журналістаў, якія працуюць у недзяржаўных выданьнях, да дзейнасьці па адстойваньню прынцыпаў свбоды слова ды аб’ектыўнай жкрналістыкі ў сваёй творчасьці. Удзельнічаць у спаборы могуць супрацоўнікі незалежных мэдыяў – як друкаваных, так і з інтэрнэт-выданьняў.

Вынікі будуць падведзеныя ў пяці намінацыях: “Найлепшы інфармацыйны матэрыял”, “Лепшая аналітычная публікацыя”, “Лепшая публікацыя літаратурна-мастацкага жанру ў журналістыцы”, “Прызнаньне калег” (для вопытных супрацоўнікаў незалежных СМІ), “Дэбют” (для журналістаў-пачаткоўцаў, стаж працы ці супрацоўніцтва якіх з рэдакцыяй ня больша за тры гады).

Арганізатары просяць прыкладаць да публікацыяў кароткія зьвесткі пра творчы шлях канкурсанта.

З конкурснымі матэрыяламі можна будзе пазнаёміцца на сайце БАЖ, а пасьля і прачытаць у часопісе “АБАЖУР”.

Як растлумачыла намесьніца старшыні БАЖ Аліна Суравец, хаця конкурс разьлічаны на сябраў ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў”, для намінацыі “Дэбют” гэта не зьяўляецца вызначальным. Галоўнае – супрацоўніцтва зь незалежным выданьнем.

*Паліна Васілёва*

ДАБРАЧЫННАСЬЦЬ

## Прадпрымальнікі клапоцяцца аб культуры

У Менску прайшла Міжнародная канфэрэнцыя “Культура і прадпрымальніцтва ў сучасным сьвеце”. Ініцыятарамі і арганізатарамі мерапрыемства выступілі ГА “Менскі сталічны саюз прадпрымальнікаў і працадаўцаў”, Міжнародны камітэт яднаньня народаў пад сьцягам міру, Інстытут парлямэнтарызму і прадпрымальніцтва, Цэнтар падтрымкі прадпрымальніцтва “XXI стагоддзе”.

На канфэрэнцыі абмяркоўваліся роля і значэньне культуры ў пасьпяховай дзейнасьці прадпрымальнікаў, этычныя прынцыпы прадпрымальніцкай дзейнасьці, мэцэнацтва як складнік актыўнай жыцьцёвай пазіцыі сучаснага прадпрымальніка, сацыяльная адказнасьць бізнэсу.

У канфэрэнцыі прынялі ўдзел навукоўцы – адмысловцы па культуры прадпрымальніцтва і бізнэс-этыцы, выкладчыкі ВНУ, прадпрымальнікі з краін СНД, якія маюць практыку сацыяльна скіраванага вядзеньня гаспадарчых справаў ды досьвед мэцэнацтва.

Арганізатары канфэрэнцыі адзначылі, што “барацьба за культуру ў яе высокім і годным значэньні – справа ня толькі дзеячаў культуры, але ўсяго чалавецтва, у першую чаргу, прадпрымальнікаў, празь сьвядомасьць якіх праходзяць ідэі развіцьця грамадзтва”.

Дарэчы, многія беларускія грамадзкія дзеячы сталі вядомыя дзякуючы ўдзелу ў культурным пераўтварэньні жыцьця. Сярод іх – беларускія асьветнікі Эўфрасіньня Полацкая і першадрукар Францішак Скарына.

*Марыя Кароль*

Выбар
Газэта Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў

Магілеўская абласная газэта. Выдавец: Магилеўская абласная кааліцыя дэмакратычных сілаў.
Галоўны радактар: Эдуард Брокараў, тэл. 545 89 83, электронная адрэса: brok61@yandex.ru Наклад: 299 асобнікаў
Падчас выданьня ужываюцца: беларуская (тарашкевіца), беларуская (наркомаўка) ды расейская мовы. Матар’ялы друкуюцца на мове аўтара. Палітычная й моўная цэнзура адсутнічае. Вітаюцца мастацкія творы, а таксама – журналісцкія матар’ялы на беларускай мове. Погляды аўтараў могуць не супадаць з пазыцыяй радакцыі. Радакцыя самастойна прымае рашэньні аб мэтазгоднасьці ўступленьня ў перапіску, а таксама аб разьмяшчэньні бясплатнай сацыяльнай раклямы